# РЭФЕРАТ

Дыпломная работа Якушэнка А.А. на тэму: Інструменты павышэння эфектыўнасці маркетынгавай дзейнасці прамысловага прадпрыемства (на прыкладзе ААТ «Савушкін прадукт»)

Дыпломная работа: 76 с., 24 табл., 4 мал., 30 крыніц, 5 прыкл.

SWOT-АНАЛІЗ, PEST-АНАЛІЗ, МАРКЕТЫНГАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, ТАВАРНАЯ ПАЛІТЫКА, ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЕ ХАРЧАВАННЕ, ВЫСОКАБЯЛКОВАЯ ПРАДУКЦЫЯ, ЛАЯЛЬНАСЦЬ СПАЖЫЎЦОЎ, ЛІЧБАВЫ МАРКЕТЫНГ, QR-ПЛАТФОРМА, КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ.

Аб’ект даследавання – маркетынгавая дзейнасць ААТ «Савушкин прадукт».

Прадмет даследавання – інструменты павышэння эфектыўнасці маркетынгавай дзейнасці прамысловага прадпрыемства.

Мэта даследавання - распрацоўка прапаноў накіраваных на павышэнне эфектыўнасці маркетынгавай дзейнасці ААТ «Савушкін прадукт» на падмурку выкарыстання сучасных маркетынгавых інструментаў. Пры выкананні работы былі выкарыстаны метады эканамічнага аналізу, параўнання, SWOT-аналіз, PEST-аналіз, мадэль пяці канкурэнтных сіл М. Портэра, графічны і іншыя.

У працэсе даследавання была дадзена характарыстыка дзейнасці ААТ «Савушкін прадукт», прааналізавана маркетынгавае мікра- і макраасяроддзе прадпрыемства, даследаваны асаблівасці таварнай, цэнавай, размеркавальнай і камунікацыйнай палітыкі арганізацыі. Была праведзена ацэнка канкурэнтнага асяроддзя прадпрыемства, выяўлены асноўныя перавагі і праблемныя аспекты маркетынгавай дзейнасці.

Падчас выканання дыпломнай работы выяўлены наступныя праблемы: высокая насычанасць рынку малочнай прадукцыі, узмацненне канкурэнцыі, неабходнасць адаптацыі прадукцыі да сучасных тэндэнцый функцыянальнага харчавання, і недастатковы ўзровень выкарыстання лічбавых каналаў узаемадзеяння са спажыўцамі.

Вынікам дыпломнай работы стала распрацоўка комплексу мерапрыемстваў, уключаючы вывад новай лінейкі высокабялковай прадукцыі, стварэнне лічбавай платформы лаяльнасці і ўкараненне сезонных абмежаваных серый прадукцыі.

Аўтар работы пацвярджае, што прыведзены ў ёй разлікова-аналітычны матэрыял правільна і аб’ектыўна адлюстроўвае стан даследуемага працэсу, а ўсе запазычаныя з літаратурных і іншых крыніц тэарэтычныя, метадалагічныя і метадычныя палажэнні суправаджаюцца спасылкамі на іх аўтараў.